ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
15 жніўня 2019 г. № 139

# Аб зацвярджэнні тыпавога вучэбнага плана дашкольнай адукацыі

На падставе часткі другой пункта 3 артыкула 151 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі (дадаецца).
2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Міністр** **І.В.Карпенка**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
15.08.2019 № 139

## Тыпавы вучэбны план дашкольнай адукацыі

| № п/п | Пералік адукацыйных галін | Колькасць вучэбных гадзін[1] на вывучэнне адукацыйных галін па групах выхаванцаў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) | Першая малодшая (ад 2 да 3 гадоў) | Другая малодшая (ад 3 да 4 гадоў) | Сярэдняя (ад 4 да 5 гадоў) | Старшая (ад 5 да 6 гадоў) | Старшая (ад 6 да 7 гадоў) |
| 1 | Фізічная культура | 1 | 2 | 3[2] | 3[2] | 3[2] | 3[2] |
| 2 | Дзіця і грамадства | 0,5 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 |
| 3 | Элементарныя матэматычныя ўяўленні | 0,5 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 4 | Дзіця і прырода | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| 5 | Развитие речи и культура речевого общения | 1 (0)[3] | 1 (0)[3] | 1 (1[4])[3] | 1 (1)[3] | 1 (1)[3] | 1 (1)[3] |
| 6 | Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін | 0 (1)[3] | 0 (1)[3] | 0/1[4] (1)[3] | 1 (1)[3] | 1 (1)[3] | 1 (1)[3] |
| 7 | Падрыхтоўка да навучання грамаце | – | – | – | – | 1 | 1 |
| 8 | Выяўленчае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 9 | Музычнае мастацтва | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 10 | Мастацкая літаратура | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 1 | 1 | 1 |
| | Агульная колькасць вучэбных гадзін (гульняў, заняткаў) на тыдзень | 8 | 10 | 11/12[4] | 14 | 15 | 15 |
| | Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка ў тыдзень на аднаго выхаванца (у астранамічных гадзінах)[5] | 0,7/0,9[4] (40/56[4] хв.) | 1,7 (1 г. 40 хв.) | 2,8/3[4] (2 г. 45 хв./ 3 г.[4]) | 4,7 (4 г. 40 хв.) | 6,3 (6 г. 15 хв.) | 7,5 (7 г. 30 хв.) |

[1] Пад вучэбнымі гадзінамі ва ўстанове дашкольнай адукацыі разумеецца час правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу (гульня, занятак), адпаведны ўзроставым магчымасцям выхаванца, санітарна-эпідэміялагічнаму заканадаўству. Працягласць заняткаў складае:

у групе другога ранняга ўзросту (ад 1 да 2 гадоў) – 5 хвілін (першае паўгоддзе), 7 хвілін (другое паўгоддзе);

у першай малодшай групе (ад 2 да 3 гадоў) – 10 хвілін;

у другой малодшай групе (ад 3 да 4 гадоў) – 15 хвілін;
у сярэдняй групе (ад 4 да 5 гадоў) – 20 хвілін;
у старшай групе (ад 5 да 6 гадоў) – 25 хвілін;
у старшай групе (ад 6 да 7 гадоў) – 30 хвілін.

[2] У тым ліку 1 занятак плаваннем (пры наяўнасці басейна).

[3] Колькасць вучэбных гадзін на рэалізацыю зместу адукацыйных галін «Развитие речи и культура речевого общения» і «Развіцце маўлення і культура маўленчых зносін» ва ўстановах адукацыі (групах), у іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, дзе навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на беларускай мове.

[4] Другое паўгоддзе.

[5] Максімальная дапушчальная вучэбная нагрузка вызначаецца шляхам памнажэння агульнай колькасці вучэбных гадзін у тыдзень, адведзеных на вывучэнне адукацыйных галін па групе выхаванцаў, на працягласць адной вучэбнай гадзіны (занятка) у залежнасці ад узросту выхаванцаў.